танцевальным образам. Эта лексическая однородность являлась своего рода свидетельством относительно равного положения мужчины и женщины в обществе, и танец как форма коммуникации подтверждает это положение [4].

**Спіс літаратуры:**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў у 3 тамах. Т. 2 / М. Багдановіч – Мінск : Навука і тэхніка, 2001. – С. 257 – 263.
2. Бессонов, П. А. Белорусские песни с подробными объяснениями их творчества и языка, очерками народного обряда, обычая и всего быта / П. Бессонов. – М. : Изд-во Общества любителей российской словесности, 1871. – 263 с.
3. Володина, Т. У белорусов были свои валькирии! Остались ли они сегодня? [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.belsat.eu/ru/news/u-belorusov-byli-svoi-valkirii-ostalis-li-oni-segodnya. – Дата доступа: 03.11.2016.
4. Канавальчык, І. Жаночы вобраз у беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі: традыцыі і наватарства / І. Канавальчык // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зборнік навуковых прац удзельнікаў X Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 29 крас. – 1 мая 2016 г.) / БДУКМ ; редкал. : Языковіч В.Р [і інш]. – Мінск : БДУКМ, 2013. – С. 61-63.
5. Лебедева, Г. Д. Балет: семиотика и архитектоника / Г. Д. Лебедева – СПб. : Лань; Планета Музыки, 2007. – 160 с.
6. Лопухов. Ф. В. 60 лет в балете / Ф. В. Лопухов. – М. : Искусство, 1966. – 424 с.
7. Пухначев, Ю. В. Число и мысли / Ю. В. Пухначев. – Вып. 4. – М. : Знание, 1981. – 176 с.
8. Чурко, Ю. М. Белорусский хореографический фольклор / Ю. М. Чурко – Минск : Выш. шк. 1990. – 415 с.



***Тамара Васюк***


## МАСТАЦКІЯ АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ ДРОБНАЙ ПЛАСТЫКІ


*У артыкуле разглядаюцца шляхі адраджэння, рэканструкцыі і развіцця традыцыйнай керамікі Беларусі. Аўтар паказвае спосабы аднаўлення і папулярызацыі традыцый старажытных тэхналогій глінянай дробнай пластыкі.*



***Tamara Vasyuk***


## ARTICTIC FEATURES OF THE BELARUSIAN SMALL PLASTIC ARTS


*The article highlights the ways of revival, reconstruction and development of Belarusian traditional ceramics. The author points out the ways of restoration and popularization of the traditions of ancient technologies of clay small plastic.*


Асноўныя рысы народнай керамікі, закладзеныя ў мінулыя стагоддзі, перадаюцца з пакалення ў пакаленне, яны фарміруюць побыт і свядомасць людзей. Стагоддзямі выпрацоўваліся метады і прыёмы апрацоўкі гліны, ўдасканальваліся формы вырабаў і тэхнікі іх аздаблення. У вырашэнні задач керамічнага рамяства майстры абапіраліся на традыцыі, у якіх раўнацэннымі фактарамі з'яўляецца спалучэнне ў адзінае цэлае тэхналагічных і мастацкіх рашэнняў.

Народна-міфалагічная свядомасць – універсальная і усеабдымная мастацкая каштоўнасць. Мастацка-вобразны характар міфалагічнага светаўспрымання праяўляецца ў творчасці народных майстроў і прафесійных мастакоў. Складанасць разумення дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва існуе ў адпаведнасці двум вытокам: дэкаратыўнаму і функцыянальнаму. Гарманізацыя асяродзя пражывання чалавека паказвае на касмічны пачатак быцця.

Традыцыйная беларуская кераміка – гэта адмысловая мастацкая дзейнасць чалавека, якая дае магчымасць ствараць вырабы з гліны: скульптурную дэкаратыўную пластыку, разнастайны посуд, цацкі і свісцёлкі. Эстэтыка рукатворнай керамікі найбольш яскрава выяўляецца ў ляпной дробнай пластыцы. Гэта асаблівая ніша ў беларускім народным мастацтве.

Дробная пластыка мае глыбокія карані і багатыя традыцыі. Падчас археалагічных раскопак на тэрыторыі Беларусі былі знойдзены зааморфныя і антрапаморфныя цацкі і скульптуры, якія датуюцца рознымі часамі, пачынаючы з неаліту. Асабліва цікавыя знаходкі дробнай пластыкі ў гліняных фрагментах, якія знойдзены на берагах Дняпра, Сожа і Прыпяці. Умоўна, але досыць рэалістычна вылеплены з гліны коні, фігуркі людзей і птушак [1].

У многіх краінах Усходняй Еўропы вырабляліся пустацелыя гліняныя цацкі-бразготкі для утварэння гуку. Яны былі ў форме шарыкаў, яек, цыліндраў з глінянымі гарошынамі ўнутры. Большасць цацак выконвала функцыю абярэгаў, на якія былі нанесеныя розныя знакі, арнаментальныя ўпрыгожванні, адтуліны і рэльефы. Навукоўцы мяркуюць, што гэта не толькі дзіцячыя цацкі, яны маглі мець рытуальнае і міфалагічнае значэнне. Паводле старажытных славянскіх павер'яў, свіст адганяў злых духаў, фігуркі людзей пазначалі продкаў і багоў. Цацкі выкарыстоўваліся ў якасці адукацыйных і выхаваўчых прыладаў. Сэнсам музычных акарын было перайманне гукаў жывой прыроды [2].

Многія цацкі майстроў з Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай і Брэсцкай абласцей захоўваюцца ў фондах музеяў этналогіі Пецярбурга і Масквы, а таксама ў прыватных калекцыях даследчыкаў культуры і мастацтва. У мастацкіх адносінах гліняная цацка спалучае ў сабе дзве асаблівасці: традыцыйнасць і сюжэтнасць. Гэта збліжае беларускую цацку з падобнымі відамі мастацтва многіх народаў свету. Народныя майстры імкнуцца да рэалістычнага адлюстравання навакольнага асяродзя. Дэталі скульптур ствараюцца пры дапамозе рэльефу, гравіроўкі і размалёўкі. Традыцыйнымі тэхналогіямі апрацоўкі прадметаў дробнай пластыкі з'яўляюцца абвара, задымленне, васкаванне.

У фондах Музея старажытнабеларускай культуры НАН Беларусі захоўваецца значная калекцыя адметнай дробнай пластыкі 20-х – 30-х гадоў XX стагоддзя майстроў-керамістаў з Ракава. Майстры з мястэчка засвоілі асаблівую стылістыку пластыка-вобразнага рашэння, якое заснавана на багатых традыцыях папярэдніх пакаленняў. Выявы «парачак» ў святочных убраннях: дам у доўгіх сукенках і кавалераў у афіцэрскіх мундзірах і капелюшах, фігуры, апранутыя па модзе таго часу, застылі ў дынамічным руху. Гліняная пластыка пакрыта каляровымі ангобамі і празрыстымі палівамі.

У 50-я – 70-я гады XX стагоддзя ў Івянцы працаваў Міхась Звярко, арыгінальны майстар дробнай пластыкі, які ствараў яе на ганчарнай аснове з выкарыстаннем роспісу і тэхнікі флеандроўкі. Выразная пластыка мядзведзяў, людзей, зуброў, львоў выканана вобразна, віртуозна, экспрэсіўна. Да Міхася Звярко беларускія майстры ніколі не выкарыстоўвалі флеандроўку ў скульптурнай пластыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Фігуратыўная лепка майстра Зінаіды Ляйко з Лепеля напоўнена пачуццём дабрыні і пяшчоты. Майстар скульптуры стварае вобразы свойскіх жывёл: коней, кароў, катоў, а таксама дзікіх зайчыкаў і ваўчкоў. Падобныя выявы былі знойдзены археолагамі каля вёскі Гарошкава Гомельскай вобласці. Каты, зайцы, ваўкі Зінаіды Ляйко набылі чалавечыя рысы: дабрыню, кемлівасць, гумар. Многія свае творы майстар выконвала з грубага падручнага матэрыялу – бетону, які не патрабуе тэрмічнай апрацоўкі. Але ў пластыцы скульптуры галоўнае не матэрыял, а вобразы.

Класічная фальклорная тэматыка была ярка адлюстравана ў дробнай пластыцы майстра з Мазыра Мікалая Мікітавіча Пушкара, таленавітага мастака-кераміста, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, члена Саюза мастакоў СССР. Яго работы выкананы ў старадаўняй тэхніцы лепкі з пласта з распрацоўкай дэталяў сюжэту. Творы «Печаная бульба», «Дзед і баба», «Хворы Мацей» дакладныя ў сваіх «тэкстыльных» фактурах і адбітках тканін на паверхні скульптур. У ХХ ст. Мікалай Пушкар быў не толькі народным майстрам, ён быў вядучым спецыялістам у дробнай пластыцы, які ўплываў на развіццё прыкладнога мастацтва Беларусі.

Мікалай Пратасеня, член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, працуе ў Салігорску. У вырабах мастака адлюстраваны шматлікія дэталі, якія паказваюць багацце аўтарскіх тэхнік і прыёмаў. Яго гліняная птушка варона, якая ў дзюбе трымае кавалачак калійнай солі, а па памерах можа змясціцца на далоні маленькага дзіцяці, стала сімвалам роднага горада Салігорска. Мікалай Пратасеня браў удзел у фестывалі-конкурсе свісцёлак «Салавейка-2015» у рамках Міжнароднага фестывалю песні і музыкі «Дняпроўскія галасы ў Дуброўне», дзе атрымаў Гран-пры. Апошнім часам майстар-віртуоз вучыць малодшае пакаленне не забываць старажытнае майстэрства нашых продкаў.

Значную частку дробнай пластыкі беларускія майстры выконваюць у традыцыйнай стылістыцы, што прадстаўляе архаічны напрамак іх творчасці. Такія вырабы не маюць другарадных дэталяў і індывідуальных характарыстык персанажаў. Гэта, напрыклад, воіны Міраслава Раманоўскага з Івянца, якія выкананы традыцыйна, калі фігура чалавека зліваецца разам з канём. Так з даўніх часоў ляпілі ваяроў майстры-керамісты на тэрыторыі Беларусі. Народны майстар Міласлаў Раманоўскі жыве і працуе ў Івянцы. Там ён нарадзіўся і з'яўляецца сапраўдным носьбітам традыцый івянецкай керамікі і свісцёлкі. Ён скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, шматразова быў адзначаны дыпломамі на рэспубліканскіх і міжнародных выстаўках-конкурсах, лаўрэат і стыпендыянт Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Яго работы вызначаюцца асабліва дасканалай лепкай, якая характэрна івянецкім майстрам папярэдняга пакалення.

Другім, больш познім напрамкам у развіцці дробнай пластыкі з'яўляецца наіўна-рэалістычная стылістыка. Яна характэрная для канца XIX і ХХ стагоддзя. У лепцы наіўна-рэалістычных жанравых сюжэтаў працуюць многія майстры Барысава, Любані, Мінска [1]. Свае здольнасці ў любым кірунку мастацтва керамікі ўвасабляе Дзяніс Гром. Музыкант і мастак у адной асобе віртуозна выконвае цацкі і музычныя гліняныя інструменты «акарыны». Ён працуе ў майстэрні керамікі музейнага комплексу старадаўніх народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі». Яго свісцёлкі і акарыны добра гучаць нават у сырым неабпаленым выглядзе. Іх пластыка абагульненая, разнастайная і вельмі матэрыяльная. Дзяніс Гром стыпендыят Фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі, выпускнік кафедры народных рамёстваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Трансфармацыя традыцый у новым часе ў асобе майстра адбылася бездакорна.

Паспяхова выконвае задачу захавання традыцый яшчэ адзін выпускнік кафедры народных рамёстваў, Іван Дашкоў. Яго лепка дробнай пластыкі выканана ў традыцыйнай тэхналагічнай апрацоўцы гліны ў абвары і задымленні, з-за чаго музычна-керамічныя вырабы майстра становяцца асабліва выразнымі і архаічнымі.

Новае пакаленне майстроў дробнай пластыкі Беларусі працуе не толькі ў традыцыйным кірунку. Шматлікія сучасныя вырабы маладых творцаў створаны з наватарскімі і аўтарскімі прыёмамі лепкі і дэкору.

Народна-міфалагічнае светаразуменне захоўваецца, пераходзячы з эпохі ў эпоху. Яно паступова развіваецца і трансфамуецца, набываючы ўнікальныя і усеабдымная мастацкія каштоўнасці. Таму неабходна захоўваць гэтую сувязь для далейшага адраджэння, равіцця і рэканструкцыі традыцыйных напрамкаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

**Спіс літаратуры:**


1. Елатомцева, И. М. Художественная керамика советской Белоруссии / И. М. Елатомцева ; ред. М. Я. Гринблат ; Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. – Минск : Наука и техника, 1966. – 190 с.
3. Сахута, Я. М. Народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 1997. – 286, [1] с. : фот.
4. Сахута, Я. М. Цацка / М. Ф. Сахута // Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 1989. – С. 519-520.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мікалай Іваненка*

## АДРАДЖЭННЕ ТРАДЫЦЫІ ВЫРАБУ ВЯСЕЛЬНАЙ ЛЯЛЬКІ НА ВІЛЕЙШЧЫНЕ

*У Вілейскай гімназіі №2 ўзноўлена мясцовая традыцыя вырабу вясельнай лялькі «Неразлучнікі». Такая лялька апошні раз выкарыстоўвалася ў вясельных рытуалах амаль сто гадоў таму. Традыцыя была страчана, але ёсць унікальны матэрыял для яе адраджэння.*

*Mikalay Ivanenko*

## REVIVAL OF TRADITIONS TO MAKE BRIDAL DOLLS IN VILEI-KA DISTRICT

*The local tradition of making a wedding doll «Not-to-tear-apart» is being re-newed in gymnasium No 2 of the town of Vileika. This kind of dolls was last used in wedding rituals almost a hun-dred years ago. The tradition was lost, but there is a unique material for its revival.*

Кожны куточак Беларусі мае сваю самабытную непаўторнасць. Адметнасць культурнай прасторы стварае своеасаблівы вобраз свету, у якім фарміруецца духоўны воблік чалавека. І таму надзвычай важна, каб кожны змалку